Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрації: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспадэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праудзівай фамілией і адрэсам таго, хто ея прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фамілией, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдації. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 21 чэрвеня (іюня) 1912 г. № 25.

ТЫЕ, КАТОРЫЕ ПАСТАНАВІЛІ ЗАСТРАХАВАЦЦА, НІХАЙ ЗВЕРНУЦЦА Ў

**Першае Узаемнае Таварыство Страхаваньня Жыцьця 1902 г.**

дзеля таго, што аснаўною думкай організатароў гэтаго чыста ўзаемнаго Таварыства было **зрабіць страхаваньне жыцьця агульнадаступным**, спадзеючыся, што **страхавацелі самі патрапяць раздзяліць свае ашчаднасьці між сабой і абойдуцца без дарагіх услуг акційных кампаній.**

Беручы пад увагу гэткую сур'ёзную і важную мэту **„Першаго ўзаемнаго Т—ва Страхаваньня Жыцьця“**, пры апрацаваньні уставы, варункоў страхаваньня і тарыфоў была звернена асаблівая увага на тое, каб, не нарушыўшы асноў устойчывасьці і моцы Т—ва і **не вымагаючы** пры тым **кругавой парукі** ад членоў Таварыства, **захаваць поўную ўзаемнасць і даць** членам Таварыства **найбольшые льготы**, якіх толькі можна дабіцца ў дзеле страхоўкі жыцьця.

Вынікам гэтаго кірунку сталіся **аснаўные льготы** страхавацелёў „Першаго Ўзаемнаго Т—ва Страхаваньня Жыцьця“.

Ўсе страхавацелі ёсць **праўдзівые члены** Т—ва, каторым устава Т—ва і полісные варункі заручаюць:

1) **Поўную ўзаемнасць** без кругавой парукі (атвецтвенасьці членоў), а іменна: учасьце у агульных сабраньнях, ў выбарах с паміж сябе Праўленьня і Рэвізійнай Камісіі, с правам быць выбраным, ў зацьверджэньні тарыфоў, сьмет і атчотоў, ў раздзеле даходоў і др.

2) **Самые танные прэміі з учасьцем** усіх страхавацелёў **ў даходах;**

3) **Самые льготные варункі разсрочкі** аплаты премій;

4) **Поўную свабоду** падарожы і заняцьця.

5) **Нетыкальнасць і бязспорнасць** полісоў;

6) **Найвышэйшая сумма выкупа** на выпадак перадтэрміновай астаноўкі страхаваньня, права **прыастаноўкі і аднаўленьня страхаваньня.**

7) Спэціальные **пазычкі для выплаты прэмій;**

8) **Выкупные і рэдукціронанные суммы**—вышэй другіх і **паказываюцца** ў полісах.

**Упраўленьне Літоўска-Беларускаго Округа.**

Вільня, Георгіеўскі праспэкт 4. — Тэлефон № 830.

**Патрэбны рупные агенты.**

*Вільня, 21 (4) чэрвеня 1912 г.*

Шырэй і шырэй развіваецца „выбарная работа“: ўсе партіі ўжо загадзя прыгатаўляюцца да выбароў у Чацьвёртую Думу, каб выбраць у дэпутаты сваіх людзей. Пры гэтым выяўляюцца вельмі цікавые рэчы.

Аказываецца, што хаця між „правымі“ партіямі вялікай розніцы німа, але яны ніяк паладзіць ня могуць, каб разам вясьці выбарную работу. Гэтак у Мінску ішла вайна між губэрнатарскай партіей і архірэйскай, хаця мэта у іх адна; гэта вайна скончылася толькі тады, калі Сынод загадаў духавенству ісьці пад каманду губэрнатарскай партіі. Так сама ў Вільні згуртаваліся ўсе „правые“ —саюзнікі, націоналісты і т. п.—у адзін „націояальны“ выбарны камітэт. Здавалося, што ўсё пойдзе гладка, і выбяруць у Думу калі не Замыслоўскаго, дык якога небудзь Ковалюка, ці іншаго з гэтай хаўрузіі без уселякіх спокак. Ажно не: як на зло, аб'явіўся другі расейскі выбарны камітэт, каторы зрабіло Сьвято-Духаўскае праваслаўнае брацтво. І тут, як у Мінску, абодвы камітэты маюць той самы дух, тую-ж самую мэту: паслаць у Думу „правых“ дэпутатоў; а ўсё-ж такі згоды між імі німа.

Сьвято-Духаўское Брацтво хочэ каб выбары ішлі пад яго камандай і каб яго слухаў „націонáльны“ камітэт. Ізноў жэ „націоналісты“ даводзяць, што ў іх камітэці зышліся ўсе „ісцінно-рускіе“ людзі, дык за імі павінно ісьці і духавенство. Спорка тут ідзе аб тое, хто будзе назначаць кандыдатоў у дэпутаты: ці архірэй, ці націоналісты?

І тутака ўжо робіцца зусім ясна, што не аб програмы і партіі сварацца людзі, не аб тое, як трэба працаваць дзеля карысьці народу, узнялася між імі спорка: проста, кожная хаўрузія хочэ паслаць у Пецербург „свайго“ чэлавечка, карыснаго для гэтай хаўрузіі...

Гэтак прыватная, асабістая карысць жмені людзей стаіць на першым мейсцы і людзі змагаюцца за яе між сабой, забываючыся, што не камітэтам павінен служыць дэпутат, а тым мільёнам народу, каторым цяпер жывецца цяжка, каторым Дума павінна памагаць вызваліцца з бяды і нядолі.

## Работы Трэйцяй Думы.

Што зрабіла Дума за пяць гадоў жыцьця? Што павінна была зрабіць? Чаго не зрабіла?

Кожын шукае атказу на гэтые пытаньня, пазіраючы на дарогу, якую прайшла Трэйцяя Дума. Кожнаму цікава ведаць, як спаўнялі сваю дэпутацкую павіннасць пасланцы народу: толькі акуратне разабраўшы паступкі Трэйцяй Думы можна хваліць, ці лаяць тых людзей, каторые, перэважываючы ўсіх сваім лікам, вялі Думу за сабой.

„Гасударственая Дума — пішэ В. Водовозов ў газэці «Запросы Жизни» (№ 24—„Итоги 3-ей Думы“) —не дала народу тэй зямлі, каторая яму патрэбна, не дала тых новых форм палітычнаго жыцьця, да каторых народ ідзе; яна не завела каконнаго парадку заместа самавольства,—на мейсцо бязсудзьдзя не паставіла акуратных судоў“.

Гэтак востра нападае на Думу

## Думкі.

Вот ужо і касу гострыць бацька—прыгатаўляецца да казьбы. І твар яго вясёлы і усьміхаецца сам да сябе... „Вось, дачушка, я буду касіць, а ты з грабелькамі прыйдзеш“,— „Прыйду, татачка, прыйду“...

Бедны мой татуля! Ты ужо нарыхтаваўся да казьбы, ужо бачыш, як тоўстымі пракосамі кладзецца трава, як сьвішчэ каса у яе гушчы! Гострыш касу і бачыш, што многа ужо ты скасіў, а сонцэ толькі збіраецца аглядаць зямлю сваім сьветлым вокам. Праз момэнт яно паслало сваіх ласкавых слуг будзіць усіх да работы. Усьміхнуўся лес, каплі расы бліснулі, як вочкі пекнай дзяўчынкі; на ўсе галасы адазваліся птушкі, пчолкі сталі цэлаваць красачкі. Усім зрабілося неяк вясёла! Вясёла і ў цябе працаўнік на душы, вясёла слухаць, як пяе твая каса! Шмат ужо гадоў ты чуеш гэтые сьпевы, многа красачак панікло галоўкамі ад тваей рукі! Але ня з злосьцю—з вялікай жальбой ты караціў ім івек: заўсягды былі яны табе любы! Ці раз ты цэлымі гадзінамі любаваўся, як цьвіце канюшына, як вясёла гудзяць чмялі. Бывала прыбягу я: „Татачка, Зьміцер прыйшоў“, а ты кажэш:—„Ніхай, сынок, пачэкае“ і, пасадзіўшы мяне на калені сабе, гладзіш сваей мазалістай рукой льняные мае валаскі і шэпчэш: „глядзі, Алеська, як красачкі цьвітуць, як мушкі з імі гавораць“. Я прыхілюся к табе галавою і неякая жаласць бярэ, хочэцца плакаць..

Родненькі мой, гаротнік дарагі! Ты прыбіраешся ахвотна да цяжкай працы, але колькі трэба нашапкаваць, пакуль вымаліш кавалак сенажаці? ці ты забыўся, што сваей хопіць толькі да сьнеданьня. Ён палажыў касу, усьмешка знікла, пабялеўшые вусны нешта шэпчуць. Аб чым ты задумаўтя? Што гэтак моцна ўскалыхнуло твае думкі? Можэ ціжар работы цябе страшыць? „Тата! можэ ты захварэў, што гэтак раптам зрабіўся бледны? Ідзі атпачынь крыху!“—«Не, я ня хворы! Але што мы будзем касіць?..

Неякая жальба сціснула маё сэрцэ, нешта гарачае пакацілося па твары. Даражэнькі мой татачка, Богам забыты Беларус! Чаму нядоля гэтак крэпка дзяржыць цябе ў сваіх кіпцях? Чаму ты, бяздольны, не крычыш на увесь сьвет, не гукаеш аб сваіх нясцерпных муках? Крычы, ва ўсе грудзі! А калі ты сам ні маеш сьмеласьці, ці ня ўмееш, дык чаму гэта ня зробяць твае сыны? Чаго яны маўчаць? Яны мусі забыліся, як бацькі іх пякуцца, а можэ ім стыдна прызнацца, што яны беларусы? Калі гэтак, дык нашто ты, маці Беларусь, карміла іх сваім хлебам, паіла сваею вадою? Нашто бацька прадаваў апошнюю кароўку ды іх вучыў? Ці-ж толькі на тое, каб яны адзелі чорну апратку, забылі сваю мову, забылі бацькоўшчыну?

Маці Беларусь! Ці доўга ешчэ над табой будзе панаваць цёмная ноч, ці доўга ешчэ будуць чурацца цябе твае сыны???

**А. Калпак.**

## Курган.

*Памяці С. Полуяна.*

I.

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы рэкі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,
Ўдзірванелы курган векавечны.

Дуб гальлё распусьціў карэнасты над ім;
Сухазельле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханьнем глухім,—
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.

На Купальле там птушка садзіцца, пяе;
У Піліпаўку воўк нема вые;
Сонцэ днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатые.

Хмары неба ўсьцілалі мо́ тысячу раз;
Пяруны білі с края да края;
Ён стаіць—гэта памяць людзкая—паказ...
Толькі гутарка ходзе такая.

II.

На гарэ на крутой, на абвітай рэкой
Лет назад таму сотня, ці болей,
Белы хорам стаяў, недаступнай сьцяной
Грозна, думна глядзеў на прывольле.

У нагах у яго разсьцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сямьёй душ падданых, пакорных.

Князь у хорамі жыў, слаўны сьвету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў—біў паклоны яму;
Спуску, ласкі не знаў непакорам.

Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваей;
Стражы князевы ў полі і дома;
Толькі модлы расьлі небу ў сэрцах людзей,
І праклянцьце расло пакрыёма.

а калі ён забудзе, аб тым, што ў яго душу залажыў Бог і пойдзе чужой дарогай, то ён нічога ня зробіць і толькі што зблудзіць.

Ці не траплялося вам, сябры вучыцелі, прачытаць калі колечы дзецям што на іх роднай мове! Што вы тады бачылі? Я часта чытаў сваім вучням газэту, байкі с календара і вучыў беларускіе вершы. Душа цешыцца, як чытаеш ім што на іх роднай, добра зразумелай мові. Ўхажу ў школу з „Нашай Нівай“, зара сьціхае гул і праносіцца радасны шэпт: „будзе чытаць вучыцель па-просту ціха!“ Мігам робіцца у школі цішына і ўсе вочкі глядзяць на мяне, як я раскрываю газэту і шукаю што-б такое прачытаць ім. Ціхутка.. Я пачынаю чытаць і ўсе слухаюць так, каб хоць і аднаго слова не прапусьціць. Чытаю казку і дачытаўся да сьмешнаго мейсца—разам, як па загаду, праносіцца вясёлы сьмех і канца яму здаецца німа, я і кажу: „будзе, даволі ўжо“ і ціш ізноў мёртвая. Прачытаў адну казку, прачытаў верш і кажу: „будзе на сягоня ўжо“—„не, ешчэ пачытайце, ешчэ, ешчэ“... Чытаю ешчэ і мусі, каб чытаў ўсю ноч, то не перэсталі-б дзеці слухаць. А возьмеш чытаць па расейску — ня тое: хлопцы адзін сьпіць, а другі штоўхае таварыша ў бок, трэйці сьмяецца, або гаворыць. Або даеш навучыцца на памяць які колечы расейскі верш—беда: тлумачыш, тлумачыш кожнае слово, аж абрыдне і рады німа. Навучыцца і сыпле, як той цецярук—нічагусенька не разбярэш.

А чаму, бо ён гаворыць толькі языком, а душа яго не ўнікае ў тое, што ён гаворыць, бо яно яму чужое. А дай навучыцца родны верш, зразу з ахвотай прымуцца і скажуць так, што міла паслухаць. Вось гэта гаворыць яго маладому сэрцу, вось гэта яму не чужое, а яго роднае, дарагое яму.

Развіваць нашу душу па нашаму, ані па чужому, гата наша павіннасць. Нам трэба чытаць дзецям і селянам нашы кніжкі, вучыць нашы вершы, старацца паднясць веру у людзей, што яны людзі, як і ўсе, што наша мова ня горшая ад другіх, бараніць нашу песьню, і не ганьбаваць сваім родным і не сароміцца яго, а любіць ўсей душой і працаваць! Працаваць трэба! Не калісь ешчэ, чэкаючы лепшых часоў, а зара не адкладаючы ні на адну гадзіну.

А цяпер прашу вас, таварышы, атказаць мне і выгаварыць свае погляды. Пішыце. дзяліцеся сваімі думкамі і жаданьнямі, тады для нас будзе ясьнейша дарога, па якой мы цьвёрда будзем усеісьці ў ясную нашу будучыну.

**М. Арол.**

# С канады.

*(Ад нашаго карэспандэнта).*

Ня скора ешчэ прыйдзе той час, каб у нашай Беларусі кожны меў пад рукой такі заработак, каб жыць па людзку, ды каб рукі былі развязаны. Чэсць і слава тым, што на мейсцы, ў родным краю шукаюць рады на нашу бяду ды знаходзяць Але і тое добра, што наш народ ня хочэ злажыўшы рукі прычэкаць голаду для цэлых губерній, як у Вялікарасеі, што ён, як мага, шукае ратунку хоць за морэм.

З Расеі ідуць людзі найбольш у Немеччыну, або у Паўночные Штаты (Амэрыку). Ў штатах для яго найгоршая работа, заработак лепшы, як у нас, але ўжо далей не так заработак расьце, як даражыня жыцьця у месьці, а кроў работніка ня вельмі там дорага цэніцца. Усюды адзінокаму цёмнаму чэлавеку лёгка саўсім прапасьці, а калі ў заработку пашанцуе, то дзеля таго заработку ды вольнаго жыцьця лёгка адрэчыся роднай стараны ды прапасьці для свайго народу. Ды трапіўшы проста з вёскі ад гаспадарскай работы у хвабрычнае пекло, беларус ня робіць таго, што найлепш умее, а круціцца каля машыны; грошы можэ і заробіць, але розуму ня вельмі набярэцца. А і тые грошы амэрыканскіе ня вельмі нашым людзям на пажытак ідуць, як і ў «Нашай Ніве» пісало. З малымі грашыма у Амэрыцы ўжо за зямлю не ўзяцца, добрую, вольную зямлю да-чыста разабралі. На зямлю ўсё больш у Канаду ідуць. Гэта пэўне ведаеце, што тут ешчэ ўсякі можэ дастаць скарбовай зямлі на выбар 4 валокі за малые грошы—праўда, далёка ад гораду, у глушы. Але-ж аднаму паміж чужых людзей ды з голымі рукамі цяжка за яе ўзяцца; гаспадарскіе машыны можна браць на выплату, але яны даражэйшы, чым у нас, а коні надта дарагіе.

І тут, як у кожнай людзкой рабоці, што аднаму цяжка, тое хаўрусам лёгка зрабіць можна

На пачатак трэба, як кажуць, хоць на насеньне людзей, каб хаўрусу не баяліся, каб патрапілі добра разабрацца ў яго простых рахунках, каб можна было напэўна ведаць, што адзін аднаго не ашукае, што ў хаўрусе кожны больш можэ зрабіць, як адзінокі. Як-бы першы хаўрус з добрых людзей працёр дарогу, як бы машына наладзілася, то я не баяўся бы прыняць да яго найцямнейшаго чэлавека. Ды забіраць хаўрусамі трэба чым больш вольнай зямлі, пакуль ёсць, бо і тут на гэта канець некалі прыйдзе.

Ёсць на сьвеці лягчэйшые заработкі, але пэўнейшаго німа. На тое. што сягоньня выробляе хвабрыка, можэ заўтра мода мінецца, або прыдумаюць нешта лепшае. На тое-ж, што на зямлі трэба выгадаваць, мода не мінецца ніколі, а даражыня што-раз павінна ісьці ў гару, бо добрые вольные зямлі скора ўсе будуць пад плугам. У чым другі наш народ за другімі шмат з-заду астаўся, а ў рабоці каля зямлі ён ня горшы за другіх, асабліва пры такой простай гаспадарцы, як у Канадзі патрэбна. На гэтай шырокай, пакуль-што аткрытай дарозі ён найлягчэй можэ другіе народы дагнаць.

Найлепш нашым эмігрантам садзіцца на зямлю гурткамі з аднаго народу—аднэй нацІі. Паравая малатарня, ведама, можэ служыць у хаўрусе і беларусу, і украінцу, і літвіну, паляку; але песьня, школа, бібліотэка кожнаму народу патрэбна свая. Як бы мы тут, на вольнай зямлі, пад вольным, роўным для ўсіх правам прайшлі хаця невялікую школу суседзкаго хаўруснаго жыцьця ды, зарабіўшы грошы, варочаліся дамоў, а ў гатовы хаўрус прыежджалі-бы з нашай старонкі новые, то было-бы добрае лекарства на многа лет на розные нашы беды.

Кажу ешчэ раз: хто там, на мейсцы, ў роднай старане стаіць пры рабоці ды бачыць з яе толк, ніхай стаіць і далей. Калі-ж ніяк ня можэ знайсьці для сябе хлеба дома, калі беда гоніць за морэ, то ніхай падбярэ сабе хоць малую хэўру гэткіх самых людзей, ніхай адзін мае больш, другі—менш грошы, абы шчырая ахвота да работы на зямлі.

Сьмешная прыгода была нідаўна у суседзтве. Да аднаго з багатшых суседзёў-фэрмэроў (мае 5 фэрм—фольваркоў, 20 валок зямлі, с 5 тысяч руб. у год прыходу) прыйшоў хлапец, украінец, гадоў 15, ды кажэ, што шукае работы, што ў месьці Эдмонтэні работы багата, але яму не хацелі даць, бо замалы. Гаспадар той ня меў ніводнаго работніка, ды згадзіў таго хлопца па 15 доляроў (30 рублёў) на месяц с тою ядою, што сам мае, для помачы ў гаспадарцы. Перэначаваў хлопец, а на другі дзень глянуў на рукі гаспадара (а той мае барадаўкі, але мы з ім знаемся 4 гады ды нам гэта ня шкодзіць) ды кажэ: «А чаму-ж то вы міні нэ сказалы, што маетэ каросту на руках? Колы так, то я у вас служыты нэ буду». І апайшоў далей шукаць работы.

З гэтай малой прыгоды бачыце, што тут і пры гатовай зямлі, пры конях і машынах лепш было-б чэлавеку с хаўрусам, як з наймом. Мае чэлавек пяць фэрм, а робіць толькі на аднэй,—чатыры так ляжаць. Часам дастане работніка для помачы, а той кіне ў найгарачэйшы час. А каб у сяўбу, або у жніво захварэў, то і ураджай гатоў прапасьці.

**Н. Чарноцкі.**

Fort Saskatchewan Aita
Canada (Alberta)
10/VI—1912.

# Жальбай зноў спатыкаю вясну...

Вось і птушкі пяюць, вось і кветкі цьвітуць—
Прыляцела весна!
Ратай ў полі гарэ, весяло на дварэ,
Зелянее трава...

А ў мяне у грудзях стогне сэрцэ ў сьлезах—
Журба мучыць душу...
Ах, чаму-ж гэта мне жыцьцё сумна плыве,—
Жальбай зноў спатыкаю вясну?!...

**Гальяш Леўчык.**

Варшава.

„Глянь у лёхі свае, ў падзямельлі глянь, князь,
„Што настроіў пад хорамам гэтым:
„Брацьця корчацца там, табой кінуты ў гразь,
„Чэрві точуць жывых іх, раздзетых.

„Ты ўсё золатам хочэш прыцьміць, загаціць...
„Ці-ж прыгледзіўся, хорамны княжэ?
„Кроў на золаці гэтым людзкая блішчыць,
„Кроў, якой і твая моц не змажэ.

„Ты брылянтамі ўсыпаў атласы і шоўк—
„Гэта цёртая сталь ад кайданаў,
„Гэта вісяльні петляў развіты шнурок,
„Гэта, княжэ, твае саматканы.

IX.

„Стол ты ўставіў ядой, косьці шмат пад сталом,—
„Гэта косьці бядноты рабочай.
„Пацешаешся белым, чырвовым віном,—
„Гэта сьлёзы нядолі сірочай.

„Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
„Адшліфована цэгла і камень,—
„Гэта памяткі—пліты з неўчасных магіл,
„Гэта сэрц скамянеўшыхся пламень.

„Люба чуці табе скочны музыкі звон:
„Ты, дружына пьеце асалоду,—
„А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
„Стогн пракляцьця табе, твайму роду?!

„Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны княжэ, ўладар!
„Госьці хмурны, а дворня знямела...
„Ну, што, княжэ? пара даць за песьню мне дар!
„Выбачай, калі спеў мо́ няўмела“.

X.

Князь стаіць, князь маўчыць; жуда, помста бье з воч;
Гулі зглухлі: ні жартаў ні сьмехаў...
Думаў князь, выдумляў, дрогнуў шабляй наўзбоч.
Толькі з лоскатам выбегло рэха.

„Гэй, ты, сонцу раўня, не на тое пазваў
„На вясельле цябе свaей княжны!..
„Ты—шалёны старык! хто цябе дзе хаваў?
„Ты, знаць, вырадак цемры сермяжнай.

„Ты адважыўся мне на сьляпы перакор
Вызваняці сусьветные трэлі;
Платы маю шмат я для такіх непакор,
„Хто сябе проці мне стаць асьмеліў.

„Я па князеўску ўсім і плачу, і люблю;
„Ты ня хочэш дукатаў,—ня трэба!...
„Ўзяці старца і гусьлі жыўцом у зямлю!
„Знае хай, хто тут пан: я, ці небо!“

XI.

Падхапілі, ўзялі гусьляра-старыка,
Гусьлі разам яго сама-гуды;
Па-над берэг круты, дзе шумела рэка,
Павялі, панясьлі на загубу.

Мейсцэ выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажні широкі, глыбокі,
Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі насып тры сажні высокі.

Не чэсалі дамоўкі яму сталяры,
Не заплакалі бліжніе вочы;
Змоўклі гусьлі і ён—с тэй пары—да пары;
Сум і сціша залеглі, як ночай.

Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў;
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў;
Шлюб-вясельле ўсё княжны гулялі.

XII.

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусьляравым наспе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо́ лет;
Зацьвілі перэказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гусьлямі дзед
С кургана, як сьнег белы, выходзе.

Гусьлі строе свае, струны звонка зьвіняць,
Жменяй водзе па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веру даць—толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

**Янка Купала.**

23/V—1910 г.

